УДК 94(476):331.108

# НЕПРАВАМЕРНЫЯ ДЗЕЯННІ ПАСАДАВЫХ АСОБ САВЕЦКАЙ БЕЛАРУСІ Ў 1970–1980-я гг.

**І. А. Пушкін**
Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт харчовых і хімічных тэхналогій,
дацэнт кафедры гуманітарных дысцыплін,
кандыдат гістарычных навук, дацэнт
e-mail: ihar.pushkin.st@gmail.com

***Анатацыя.*** *У артыкуле прыведзены факты неправамерных дзеянняў пасадавых асоб Савецкай Беларусі ў 1970–80-я гг. Зроблена выснова, што прасочвалася тэндэнцыя не да скарачэння, а да павелічэння колькасці крадзяжоў, падману і злоўжыванні ўладай у асяроддзі кіруючых кадраў.*

***Ключавыя словы:*** *Савецкая Беларусь, БССР, кадры, службовыя асобы, неправамерныя дзеянні, крадзяжы, прыпіскі.*

***Annotation:*** *The article presents the most common facts of illegal actions of officials of Soviet Belarus in the 1970s–80s. It is concluded that there was a tendency not to reduce, but to increase the number of theft, deceit and abuse of power among the leading cadres.*

***Keywords:*** *Soviet Belarus, BSSR, personnel, officials, illegal actions, theft, change control information.*

Наша мэта — прааналізаваць неправамерныя паводзіны кіруючых кадраў у эканоміцы БССР у 1970-я – першай палове 1980-х гг., дзеянні і паводзіны, якія не толькі адхіляліся ад агульнапрынятых, найбольш распаўсюджаных і ўстойлівых грамадскіх нормаў, але мелі супрацьпраўны характар і аказалі істотны ўплыў на фарміраванне прававой культуры беларускага грамадства. Фарміраванне прававой культуры ў савецкіх грамадзян, неправамерныя дзеянні пасадавых асоб разглядаліся шэрагам даследчыкаў у СССР і Беларусі [1–11].

Варта падкрэсліць, што намі прааналізаваны толькі факты, якія мелі шырокі грамадскі рэзананс і іх немагчыма было схаваць ад грамадскасці. Шматлікія факты па ідэалагічных прычынах замоўчваліся і не даводзіліся да ведама грамадзян.

У 1972 г. сакратар Віцебскага абласнога камітэта Камуністычнай партыі Беларусі (АК КПБ), выступаючы на абласным пленуме КПБ, адзначыў факты «хозяйственного обрастания и использования служебного положения в личных целях» [12, арк. 17]. Сакратар Магілёўскага абкама КПБ, падводзячы вынікі працы за 1976–77 гг., падкрэсліў: «За два года освобождено от занимаемых должностей 80 работников номенклатуры обкома КПБ, которые утратили авторитет недостойным поведением и по своим деловым и моральным качествам не могли больше оставаться на ответственных должностях… Много фактов, когда

отдельные “горе-руководители” говорили одно, провозглашали с трибуны о высоких моральных качествах, а делали совсем другое, по уши влезали в грязь стяжательства, теряли совесть, запускали руку в государственный карман» [13, арк. 127–129].

Аналіз матэрыялаў АК КПБ дазволіў выявіць негатыўныя аспекты ў складзе і фарміраванні кадравага складу БССР у 1970–80-я гг. Прыпіскі, ашуканства, крадзеж дзяржаўных сродкаў і ўласнасці мелі месца на прамысловых прадпрыемствах, прадпрыемствах транспарту, гандлю, у будаўнічых арганізацыях і г. д. Падобнае назіралася і ў іншых рэгіёнах СССР. Праваахоўнымі структурамі з дапамогай кантрольных органаў былі выяўлены нават факты арганізаванай і карумпіраванай злачыннасці. Найбольш вядомы ў БССР так званыя мінская і аршанская справы [2, с. 71; 10, с. 95].

Адной з найбольш хвалюючых грамадства праблем была жыллёвая. Пытанні неправамернага размеркавання жыллёвага фонду пастаянна ўздымаліся савецкімі грамадзянамі падчас сходаў у працоўных калектывах, індывідуальных або калектыўных зваротах у вышэйстаячыя органы ўлады. Партыйна-савецкае кіраўніцтва рэагавала на звароты, прымала меры, але злоўжыванні працягваліся. У людзей на побытавым узроўні сфарміравалася думка аб тым, што каб вырашыць пытанне аб паляпшэнні сваіх жыллёвых умоў, неабходна даваць хабар чыноўнікам жыллёвых аддзелаў гар- і райвыканкамаў.

Спробы адміністрацыйнага кантролю не заўжды давалі належных вынікаў таму, што негатыўныя тэндэнцыі назіраліся і сярод партыйна-савецкага кіраўніцтва. У 1970–71 гг. за праяўленую нясціпласць пры вырашэнні жыллёва-кватэрных пытанняў былі пакараныя ў рознай меры старшыні Касцюковіцкага, Клімавіцкага, Хоцімскага райвыканкамаў Магілёўскай вобласці. У 1975 г. інспектарская група ЦК КПБ выявіла неабгрунтаваную замену кватэр адказнымі работнікамі Магілёўскага аблвыканкама і абкама КПБ [9, с. 28]; у Гомельскай вобласці за злоўжыванні былі вызвалены ад займаемай пасады намеснік старшыні аблвыканкама, старшыня Гомельскага гарвыканкама, намеснік старшыні Гомельскага гарвыканкама, другі сакратар Мазырскага РК КПБ і інш. [14, арк. 55]. У 1979 г. на пасяджэнні бюро Гомельскага АК КПБ у чарговы раз разглядалася пытанне аб злоўжываннях некаторых кіруючых работнікаў Гомельскай вобласці [15, арк. 2–7].

На розных партыйна-савецкіх і гаспадарчых форумах неаднаразова падкрэслівалася, што найважнейшай якасцю, якая характарызуе маральнае аблічча кіраўніка, з’яўляецца праўдзівасць. Але на практыцы адзначаліся не адзінкавыя факты, калі кіруючыя работнікі, каб стварыць уражанне ўяўнага дабрабыту, станавіліся на шлях падману дзяржавы, прыпісак і ашуканства, у выніку — незаконныя выплаты прэмій, напрыклад на Магілёўскім

мясакамбінаце і Магілёўскім ліфтабудаўнічым заводзе. Прычым на апошнім толькі за 1977–1978 гг. незаконна выплацілі 120 тыс. рублёў прэмій: амаль тысячу атрымаў дырэктар завода, а сакратар партыйнага камітэта завода — 1 тыс. 103 руб. [9, с. 28]. Паводле звестак пракуратуры, прыпіскі да плана здабычы нафты ў 1972 г. былі арганізаваны начальнікам аб’яднання «Беларуснафта», а выканаўцамі сталі начальнік і галоўны інжынер упраўлення «Рэчыцанафта». У выніку прыпісак незаконна было выплачана прэмій адказным работнікам аб’яднання «Беларуснафта» і «Рэчыцанафта» — 11 тыс. 700 руб. [16, арк. 18–20].

У першай палове 1970-х гг. калектыўнымі крадзяжамі дзяржаўных сродкаў шляхам складання фіктыўных працоўных пагадненняў займаліся ў вытворчым аб’яднанні (далей — ВА) «Бабруйсксельмаш». У ліку ініцыятараў былі намеснік генеральнага дырэктара аб’яднання, начальнікі планавага і вытворчага аддзелаў, выконваючы абавязкі галоўнага бухгалтара. Доўгі час у будаўнічым упраўленні № 58 трэста «Лаўсанбуд» (г. Магілёў) дзейнічала група раскрадальнікаў, у якой адным з актыўных удзельнікаў з’яўляўся сам начальнік гэтага ўпраўлення [9, с. 27]. У 1982 г. у крадзяжах дзяржаўнай маёмасці пракуратура БССР абвінавачвала былога генеральнага дырэктара ВА «Бабруйскшына» (1978–1982) [17, арк. 80].

За 1971–1975 гг. органамі народнага кантролю за прыпіскі і падман дзяржавы ў Магілёўскай вобласці былі прыцягнуты да адказнасці 644 пасадавыя асобы [9, с. 28]. У Віцебскай вобласці за 1975–1980 гг. больш за 100 кіраўнікоў за розныя злоўжыванні атрымалі спагнанні па лініі КПСС, 27 былі вызвалены ад займаемых пасад. У наступны перыяд сітуацыя ў вобласці толькі пагаршалася. Так, толькі за 1981 г. былі прыцягнуты да крымінальнай адказнасці 138 кіраўнікоў [18, арк. 86].

У 1984 г. былі зафіксаваны парушэнні дзяржаўнай і фінансавай дысцыпліны дырэкцыяй Беларускага металургічнага завода, [19, арк. 101–103]. 15 сакавіка 1984 г. за крадзеж будаўнічых матэрыялаў узбудзілі крымінальную справу ў дачыненні да дырэктара механічнага завода ВА «Бабруйскшына». У мэтах узмацнення барацьбы з крадзяжамі ў 1984 г. у штат аддзела па барацьбе з крадзяжамі сацыялістычнай уласнасці (АБКСУ) Першамайскага РАУС г. Бабруйска быў уведзены спецыяльны работнік толькі для аператыўнага абслугоўвання аднаго ВА «Бабруйскшына» [20, арк. 4–7].

Органы дзяржаўнай статыстыкі Магілёўскай вобласці ў другім паўгоддзі 1985 г. праверылі 442 прадпрыемствы і арганізацыі. Прыпіскі і скажэнні справаздачнасці былі на 33,7 % правераных прадпрыемствах і арганізацый [21, арк. 27–28]. У 1987 г. кантрольна-рэвізійным упраўленнем Міністэрства фінансаў БССР прыпіскі і скажэнні справаздачнасці выявілі на 68 (54,8 %)

з 124 прадпрыемстваў і арганізацый, факты незаконнай выплаты прэмій — на 46 (37,1 %) [22, арк. 214].

На фарміраванне прававой культуры грамадства ўплывалі і такія фактары, як неналежныя патрабаванні і адсутнасць высокай прынцыповасці пры адзнацы неправамерных дзеянняў пасадавых асоб. Часта замена кіруючых работнікаў уяўляла простую механічную перастаноўку кадраў. Так, дырэктар Магілёўскага камбіната будаўнічых матэрыялаў займаўся прыпіскамі і ашуканствам. Яго вызвалілі ад працы «па ўласным жаданні» і тут жа прызначылі дырэктарам Магілёўскага аб’яднання па хімчыстцы і лазнева-пральнаму абслугоўванню. У трэсце «Магілёўсельбуд» у свой час за прыпіскі, крадзеж будаўнічых матэрыялаў і іншыя злоўжыванні быў зняты з працы начальнік ПМК-58. Вельмі хутка ён быў прызначаны начальнікам вытворчага аддзела, а потым і галоўным інжынерам ПМК-44 [9, с. 27]. Намеснік начальніка ўпраўлення мясцовай прамысловасці Віцебскай вобласці быў вызвалены ад пасады за злоўжыванне службовым становішчам, але адразу быў прызначаны дырэктарам хімзавода, затым намеснікам генеральнага дырэктара ВА «Хімпласт», а ў пачатку 1972 г. быў рэкамендаваны на пасаду дырэктара завода жалезабетонных вырабаў трэста «Віцебскаблсельбуд» [12, арк. 14–15]. На працягу 1971–1972 гг. у Магілёўскім абласным вытворчым аб’яднанні малочнай прамысловасці былі зняты з пасад 9 дырэктараў прадпрыемстваў, але ім адразу знайшлі іншую кіруючую працу [23, арк. 15]. У кастрычніку 1974 г. за хабар, спекуляцыю і злоўжыванне службовым становішчам быў арыштаваны і ў ліпені 1975 г. асуджаны на 6 год пазбаўлення волі дырэктар аб’яднання па продажы мэблі Гомельскага гарпрамгандлю. Нягледзячы на тое, што была ўзбуджана крымінальная справа, яго рэкамендавалі і выбралі дэпутатам гарадскога савета [24, арк. 132–134].

Такім чынам, у Савецкай Беларусі ў 1970–1980-я гг. прасочвалася тэндэнцыя не да скарачэння, а да павелічэння колькасці растрат і крадзяжоў, у выніку чаго народнай гаспадарцы наносіўся вялікі матэрыяльны ўрон. Шматлікія факты прыпісак і ашуканства ставяць пад сумненне дакладнасць справаздачных лічбаў аб выкананні планаў і праграм эканамічнага развіцця БССР. За ўвесь час пабудовы сацыялізму і камунізму партыйна-савецкае кіраўніцтва так і не вырашыла праблему ашуканства і крадзяжоў у асяроддзі кіруючых кадраў. У шэрагу гарадоў і раёнаў памяркоўна адносіліся да тых работнікаў, якія скампраментавалі сябе і ім вельмі часта знаходзілі новыя кіруючыя пасады. Усё гэта выклікала сацыяльную напружанасць у грамадстве, незадавальненне насельніцтва дзейнасцю органаў улады і кіравання, міліцыяй рэспублікі. Партыйна-дзяржаўнае кіраўніцтва губляла аўтарытэт, што разам з эканамічнымі праблемамі прывяло да распаду СССР.

1. Агееў А. Р. Карупцыйныя праявы на прамысловых прадпрыемствах усходніх рэгіёнаў БССР у 1956–1970 гадах і меры іх прадухілення // Карупцыйныя рызыкі кадравага патэнцыяла Беларусі : зб. навук. арт. / уклад. Ю. М. Бубнаў, І. А. Пушкін; рэдкал.: Ю. М. Бубнаў (адк. рэд.) [і інш.]. Магілёў : МДУХ, 2019. С. 21–31. Вернуться к статье

2. Барвінок К. І., Саракавік І. А. Кадравая палітыка ў сістэме МУС Беларусі ў 60–80-х гадах XX ст. // Весці НАНБ. Сер. гуманітар. навук. 2005. № 4. С. 69–75. Вернуться к статье

3. Борьба с должностными преступлениями : сб. науч. тр. / Всесоюз. ин-т по изуч. причин и разраб. мер предупреждения преступности. М. : [б. и.], 1977. 176 с. Вернуться к статье

4. Бубнов Ю. М. Социологические очерки мздоимства. Минск : Изд. центр БГУ, 2010. 256 с. Вернуться к статье

5. Владимиров В. А., Ляпунов Ю. И. Ответственность за корыстные посягательства на социалистическую собственность. М. : Юрид. лит., 1986. 224 с. Вернуться к статье

6. Галахова А. В. Превышение власти или служебных полномочий. М. : Юрид. лит., 1978. 185 с. Вернуться к статье

7. Папиашвили Ш. Г. Должностные преступления в теории уголовного права, законодательстве и судебной практике. Тбилиси : Изд-во Тбил. ун-та, 1988. 302 с. Вернуться к статье

8. Повышение эффективности борьбы с хищениями социалистического имущества и должностными преступлениями : сб. науч. тр. / Кубан. гос. ун-т. Краснодар : Кубан. гос. ун-т, 1987. 159 с. Вернуться к статье

9. Пушкін І. А. Кадравая палітыка партыйна-дзяржаўнага кіраўніцтва БССР у 1970-я гг. (на прыкладзе Віцебскай і Магілёўскай абласцей) // Весн. Магілёўскага дзярж. ун-та імя А. А. Куляшова. Сер. А. Гуманітарныя навукі. 2018. № 2. С. 25–30. Вернуться к статье

10. Пушкін І. А. Вытокі карупцыі і злоўжыванняў уладай у савецкім мінулым (на прыкладзе Беларусі) // Українознавчий альманах. Вип. 24. Київ, 2019. С. 93–100. Вернуться к статье

11. Светлов А. Я. Ответственность за должностные преступления. Киев : Наук. думка, 1978. 303 с. Вернуться к статье

12. Протокол XI пленума Витебского ОК КПБ 28–29.11.1972 г. // Дзяржаўны архіў Віцебскай вобласці (ДАВц). Ф. 1-п. Воп. 124. Спр. 8. Вернуться к статье

13. Протокол № 11 заседания пленума Могилевского обкома КПБ от 19.04.1978 г. // Дзяржаўны архіў грамадскіх аб’яднанняў Магілёўскай вобласці (ДАГАМаг). Ф. 9. Воп. 159. Спр. 109. Вернуться к статье

14. Протокол XIX Гомельской областной партийной конференции (1975) // Дзяржаўны архіў грамадскіх аб’яднанняў Гомельскай вобласці (ДАГАГом). Ф. 144. Воп. 144. Спр. 1. Вернуться к статье

15. Записка партийной комиссии при ЦК КПБ // ДАГАГом. Ф. 144. Воп. 153. Спр. 111. Вернуться к статье

16. Письмо прокуратуры БССР в Гомельский ОК КПБ от 30.08.1974 г. // ДАГАГом. Ф. 144. Воп. 142. Спр. 36. Вернуться к статье

17. Информация прокурора БССР // ДАГАМаг. Ф. 9. Воп. 170. Спр. 80а. Вернуться к статье

18. Протокол VII пленума Витебского областного комитета КПБ. 02.09.1982 г. // ДАВц. Ф. 1-п. Воп. 154. Спр. 11. Вернуться к статье

19. Письмо Стройбанка и Облфо в Гомельский ОК КПБ от 07.05.1984 г. // Дзяржаўны архіў Гомельскай вобласці (ДАГом). Ф. 1174. Воп. 8. Спр. 1682. Вернуться к статье

20. Записка о принятых мерах по борьбе с правонарушениями в ПО «Бобруйскшина» от 23.03.1984 г. // ДАГАМаг. Ф. 9. Воп. 178. Спр. 121. Вернуться к статье

21. Информация статистического управления Могилевской области от 08.01.1986 г. // ДАГАМаг. Ф. 9. Воп. 181. Спр. 115. Арк. 27–28. Вернуться к статье

22. Протокол координационного совета по упорядочиванию проверок и повышению эффективности контроля от 22.07.1987 г. // ДАГом. Ф. 1174. Воп. 8. Спр. 2022. Вернуться к статье

23. Протокол заседания бюро Могилевского ОК КПБ от 18.05.1973 г. // ДАГАМаг. Ф. 9. Воп. 151. Спр. 16. Арк. 14–16. Вернуться к статье

24. Справка о фактах неправильного поведения некоторых работников от 15.08.1975 г. // ДАГАГом. Ф. 144. Воп. 144. Спр. 37. Вернуться к статье